# 5 Клас

## Сачыненне-апавяданне на аснове ўласных назіранняў

► Разгадайце рэбус, дзе зашыфравана расліна. (Клён.)




► З «воблака слоў» выберыце тыя, што характарызуюць наша дрэва.




► Састаўленне плана.

| План |
| --- |
| 1. Пачатак (дзе разгортваюцца падзеі?) |
| 2. Асноўная частка (развіццё падзей + апісанне клёна): |
| а) ствол; |
| б) крона; |
| в) памер (вышыня); |
| г) таўшчыня; |

| План |
|---|
| д) адметнасць; |
| е) для чаго пасадзілі (расце)? |
| 3. Заключная частка (развязка падзей) |

## Сачыненне-апавяданне пра выпадак з жыцця

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (калі і дзе адбыўся выпадак?) |
| 2. Асноўная частка (развіццё падзей): |
| а) як усё пачыналася, развівалася? |
| б) што адбылося ў кульмінацыйны момант? |
| 3. Заключная частка (развязка падзей) |

## Сачыненне-апісанне на аснове апорных слоў

► Практыкаванне «Лугавыя кветкі».

Прачытайце назвы кветак на рускай і беларускай мовах, падкрэсліце тыя, якія могуць расці на лузе.

бархатцы — аксамі́ткі
василёк — васілёк, валошка
вьюнок — бярозка
гвоздика — гваздзі́к
георгина — вяргіня
гладиолус — гладыёлус
жасмин — язмі́н
иван-чай — скры́пень
ирис — касач
клевер — канюшына
колокольчик — званочак
кувшинка — гарлачык
лилия — лілея

лютик — казялец, люцік
мать-и-мачеха — падбел
настурция — настурка
ноготки — наго́ткі
одуванчик — дзьмухавец
перелеска — пралеска
пион — півоня
подсолнух — сланечнік
роза — ружа
ромашка — рамонак
сирень — бэз
тюльпан — цюльпан
флокс — флёкс

- З дапамогай прыметнікаў і слоў, што абазначаюць назвы лугавых кветак, утварыце словазлучэнні.

*Прыметнікі*: лугавы, зіхатлівы, блакітны, нізкарослы, прыгожы, завялы, пахучы, духмяны, незаўважны, шыракалісты, аксамітны, вастралісты, сіні, ценелюбівы, дзікарослы, ярка-зялёны, белы, малапрыкметны, грацыёзны і інш.

► Практыкаванне «Які дождж? Што робіць дождж?»

Запоўніце табліцу.

| Які дождж? | Што робіць дождж? |
| --- | --- |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

► Практыкаванне «Вясёлка».

Прачытайце.

Цікава ведаць, што...

- гэта прыродная з’ява ўзнікае тады, калі скрозь хмары прабіваецца сонца, вось-вось пойдзе дождж ці ён толькі што скончыўся. Праменьчыкі сонца праймаюць кропелькі дажджу, якія ў сваю чаргу працуюць як фільтр, разбіваюць белы свет сонечнага промня на розныя колеры. Кроплі вады адхіляюць святло на розную адлегласць, таму і атрымліваецца рознакаляровая палоска, якая ў навуцы называецца «спектр»;
- вясёлка бывае перламутравай, няяркай, шматколернай, крыштальнай, непрацяглай, вадзяной, алмазнай, сонечнай, асляпляльнай, яркай, нечаканай, радаснай, працяглай, дугападобнай, зіготкай, іскрыстай, прыгожай, доўгачаканай.

► Састаўленне плана.

| План |
| --- |
| 1. Пачатак (пра што пойдзе размова?)<br>2. Асноўная частка (апісанне лугу):<br>а) нежывая прырода (сонца, дождж, вясёлка);<br>б) жывая прырода (кветкі, дрэва, насякомыя).<br>3. Заключная частка (уражанне) |

# 6 Клас

## Сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі па апорных словах

► Прачытайце словы і спалучэнні слоў.

Зляпіў Дзеда Мароза, чорныя вугольчыкі, морква, у рукі, даў скрыначку, насыпаў зярнят, прыляцела сінічка, дзеўбанула, снягір апусціўся, нахабны верабей, чорная галка, птушкі падзяўблі і разляцеліся, пустая кармушка, злосная галка, схапіла моркву, паляцела, без носа.

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (калі і дзе адбыўся выпадак?) |
| 2. Асноўная частка (развіццё падзей): |
| а) як усё пачыналася, развівалася? |
| б) што адбылося ў кульмінацыйны момант? |
| 3. Заключная частка (развязка падзей) |

## Сачыненне-апавяданне з апісаннем прымет жывёл

► Практыкаванне «Якія жывёлы?»

Запоўніце табліцу, правільна размеркаваўшы прыметы жывёл.

| № | Характарыстыка | Прымета |
|---|---|---|
| 1 | Месца пражывання | |
| 2 | Спосаб харчавання | |
| 3 | Узрост | |
| 4 | Памер | |
| 5 | Характар (паводзіны) | |
| 6 | Стан | |
| 7 | Карысць | |

*Словы для выкарыстання*: жорсткія, малыя, карысныя, старыя, бязлітасныя, галодныя, буйныя, раслінаедныя, агрэсіўныя, свойскія, вялікія, ласкавыя, шкодныя, драпежныя, прыемныя, дзікія, слабыя, маладыя, насякомаедныя, верныя, невысокія, марскія,

нясмелыя, усёедныя, лянівыя, хворыя, мёртвыя, сарамлівыя, марудлівыя, даверлівыя, спрытныя, хітрыя, насцярожаныя, раненыя.

► Успрыманне на слых урыўка з твора Я. Коласа «Савось-распуснік».

**Чэк-ліст**

| Частка цела | Які? Якая? Якія? |
|---|---|
| Нос | |
| Хвост | |
| Кіпцік | |
| Лапкі | |
| Шарсцінaчкі | |
| Губкі, зубкі | |
| Вусы | |
| Спінка | |

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (дзе і пра каго разгортваюцца падзеі?)<br>2. Асноўная частка (развіццё падзей + апісанне жывёлы):<br>а) мянушка;<br>б) галава, морда (вочы, вушы, нос);<br>в) тулава (памер, поўсць);<br>г) лапы;<br>д) хвост;<br>е) характар.<br>3. Заключная частка (развязка падзей) |

## Сачыненне-апавяданне з апісаннем памяшкання

► Практыкаванне «Якія памяшканні?»

Запоўніце табліцу, правільна размеркаваўшы прыметы памяшканняў.

| № | Характарыстыка | Прымета |
|---|---|---|
| 1 | Памер | |
| 2 | Мэта (прызначэнне) | |
| 3 | Асветленасць | |

*Словы для выкарыстання*: вялікае, адміністратыўнае, прасторнае, невялікае, малое, змрочнае, велізарнае, студэнцкае, дапаможнае, доўгае, офіснае, спецыяльнае, вялізнае, вузкае, непашкоджанае, светлае, функцыянальнае, дзіцячае, высокае, утульнае, бальнічнае, рабочае, дачнае, падрыхтаванае, цёмнае, тэхнічнае, прамавугольнае, службовае, зручнае.

► Стаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (дзе разгортваюцца падзеі: кватэра, дом, музей, тэатр?) |
| 2. Асноўная частка (развіццё падзей + апісанне памяшкання): |
| а) сцены — (якія?)... |
| б) дзверы — (якія?)... |
| в) вокны — (якія?)... |
| г) мэбля, абстаноўка (стол, крэслы, шафа, канапа, іншыя прадметы ў пакоі). |
| 3. Заключная частка (развязка падзей) |

## Сачыненне-апісанне родных мясцін

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (дзе знаходзяцца родныя мясціны?) |
| 2. Асноўная частка (апісанне родных мясцін): |
| а) горад, вёска; |
| б) лес, поле, луг, возера, рака; |
| в) расліны, жывёлы, сябры. |
| 3. Заключная частка (ураджанне) |

# 7 Клас

## Сачыненне-апісанне знешнасці чалавека

► Работа ў групах.




- Карыстаючыся алгарытмам і матэрыялам пр. 171 падручніка, апішыце знешнасць аднакласніка (матулі, сяброўкі, брата і інш.).

| |
|---|
| РОСТ — вельмі нізкі, нізкі, ніжэй сярэдняга, сярэдні, вышэй сярэдняга, высокі, вельмі высокі |
| ТВАР |
| ВАЛАСЫ |
| ЛОБ |
| ВОЧЫ |
| ПОЗІРК |
| БРОВЫ — прамыя, дугаватыя, звілістыя, густыя, рэдкія |
| НОС |
| ВУШЫ |
| РОТ — малы, сярэдні, вялікі |
| ВУСНЫ |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ПАДБАРОДАК |  адхілены назад |  выступае |  вузкі |  шырокі |

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (агульнае ўражанне ад асобы (месца, час, абставіны сустрэчы; імя, узрост і г. д.).<br>2. Асноўная частка:<br>а) адметныя прыметы (дэталі) знешнасці асобы:<br>• фігура, рост;<br>• галава, валасы, лоб, вочы, бровы, нос, вушы, рот, вусны, падбародак;<br>б) рысы характару асобы, якія выяўляюцца праз дэталі знешнасці.<br>3. Заключная частка (адносіны да асобы (яе ацэнка) |

## Сачыненне-апісанне вёскі (горада, мікрараёна)

► Арфаграфічная хвілінка.

Прачытайце. Што абазначаюць выдзеленыя словы? Растлумачце, якія літары неабходна пісаць у словах. Расстаўце знакі прыпынку.

Нарадзі(у,ў)ся ты (у,ў) *вёсцы_ фальварку_ сяле_*
На *хутары_* ці (у,ў) *гора(д,дз)е* дзесьці.
Запомні! Ра(д,дз)імай наза(у,ў)жды для ц..бе
Застане(ц,цц)а гэта.. месца.

► Дапоўніце сказы.

Наша ўстанова адукацыі знаходзіцца ў ... (горадзе, вёсцы, гарадскім пасёлку)
Гэты населены пункт ... па памеры (вялікі, невялікі, малы)
Ён размешчаны ... (у ... вобласці, ... раёне, на поўначы Беларусі...)
Побач (праз яго) працякае рака (рачулка) ... (Прыпяць, Пціч, Сож...)
Назва населенага пункта паходзіць ад ...
Тут ёсць ... (пошта, сельскі дом культуры, амбулаторыя агульнай практыкі, музей, бібліятэка...)
Гэта радзіма ... (знакамітыя людзі: пісьменнікі, кампазітары, ганаровыя грамадзяне...)

- Састаўленне плана.

1) Асноўныя звесткі:

- назва беларуская, у аг. Каменю́кі (Каменюкі́) знаходзіцца Рэзідэнцыя Дзеда Мароза), састарэлыя назвы, народныя назвы і да т. п.;
- размяшчэнне ў адносінах да адміністрацыйнага цэнтра (цэнтра раёна, сельскага селішча), іншых буйных населеных пунктаў і іншых геаграфічных аб’ектаў — рэк, азёр, узгоркаў і інш;
- памер населенага пункта, геаграфічнае апісанне тэрыторыі, планы і схемы.

2) Гісторыя населенага пункта:

- дата заснавання (з указаннем крыніцы інфармацыі);
- паданне (легенда);
- колькасць жыхароў, нацыянальны склад;
- аб’екты сацыяльнай інфраструктуры (школы, бальніцы, бібліятэкі і г. д.), іх апісанне;
- дзеючыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя аб’екты, іх апісанне і роля;
- аб’екты рэлігійнага культу (цэрквы, капліцы, мячэці і да т. п.), могілкі;
- іншыя славутасці.

3) Жыхары населенага пункта.
Напрыклад, такімі асобамі могуць быць:

- Героі Сацыялістычнай Працы;
- ганаровыя грамадзяне;
- кіраўнікі адміністрацый, старшыні калгасаў;
- пісьменнікі і паэты;
- удзельнікі творчай самадзейнасці, работнікі культуры;
- святары;

- работнікі прадпрыемстваў, адзначаныя ўзнагародамі і званнямі.

4) Агульнае ўражанне ад населенага пункта.

Слоўнік
аллея — прысады, алея
беседка — альтанка
ворота — брама
граница — мяжа
деревня — вёска
дорога — дарога, гасцінец (вялікая дарога, тракт)
дорожка (тропинка) — сцяжынка
железная дорога — чыгунка
жители — жыхары
забор — плот, тын
здание — будынак
калитка — брама
качели — арэлі, гушкалка
колодец — калодзеж
крыльцо — ганак
крыша — дах, страха (саламяная)
лестница — лесвіца
мельница — млын
население — насельніцтва
наследство — спадчына
область — вобласць
общество — грамадства
ограда — агароджа
остановка — прыпынак
памятник — помнік
перила — поручні, парэнчы
площадь — плошча
поезд — цягнік
потомки (наследники) — нашчадкі
предки — продкі
проспект — праспект
путь — шлях
рельсы — рэйкі
светофор — святлафор
скамейка — лаўка, заслон
событие — падзея
столб — слуп
страна — краіна

ступенька — прыступка
улица — вуліца
флаг — сцяг
фонарь — ліхтар
фундамент — падмурак
уголок — куток
шоссе — шаша
Отчизна — Айчына, Бацькаўшчына

## Сачыненне-апавяданне пра свой род, сваіх продкаў («Памяць продкаў не згасне»)




► Запоўніце табліцу.

| | |
|---|---|
| Месца, дзе жылі вашы продкі | |
| Традыцыі, сямейныя рэліквіі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне | |

| | |
|---|---|
| Продкі, што прымалі ўдзел у важных гістарычных падзеях (змагаліся за Радзіму падчас бітв, паўстанняў, войн) | |
| Найбольш пашыраныя прафесіі вашых родных | |
| Таленавітыя родзічы | |

► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць (чаму не згасне памяць продкаў?) | Па-моймy, я думаю, я перакананы, мне здаецца |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | Па-першае, па-другое, напрыклад, акрамя гэтага, каб пераканацца, чаму ж, і нарэшце |
| Вывад | Вынік разважання | Таму, такім чынам, так як, словам, усё гэта, значыць |

## Кантрольнае сачыненне «Кніга, якая больш за ўсё ўразіла»

► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць (чым уразіла кніга?) | Па-моймy, я думаю, я перакананы, мне здаецца |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | Па-першае, па-другое, напрыклад, акрамя гэтага, каб пераканацца, чаму ж, і нарэшце |
| Вывад | Вынік разважання | Таму, такім чынам, так як, словам, усё гэта, значыць |

► Матэрыял для падрыхтоўкі да кантрольнага сачынення.

Жанравую разнастайнасць літаратуры даволі складана класіфікаваць. Праблемы ўзніклі тады, калі змешванне жанраў стала адной з асноўных рыс сучаснай мастацкай літаратуры. Аднак можна вылучыць некалькі груп, з дапамогай якіх у асноўным рэалізуецца галоўная ідэя мастацкага твора.

| | |
|---|---|
| Гістарычны раман | Расказвае аб гістарычных падзеях, якія адбываліся ў мінулым |
| Дэтэктыў і трылер | Вострасюжэтная літаратура, дзе расказваецца пра расследаванне загадкавага выпадку, часцей за ўсё злачынства. Абавязковымі складнікамі дэтэктыва з'яўляюцца загадкавае здарэнне або злачынства, расследаванне, якое вядуць галоўныя героі, і разгадка з тлумачэннем, а таксама падказкі, якія чытач атрымлівае па ходзе апавядання |
| Раман пра каханне | У цэнтры твора знаходзяцца адносіны і рамантычнае каханне паміж людзьмі, таксама мяркуецца «эмацыйна здавальняючы і аптымістычны фінал» |
| Філасофская проза | Ілюструе тыя ці іншыя філасофскія канцэпцыі. Часта павінна праілюстраваць тую ці іншую філасофскую пазіцыю. Некаторыя творы, ахарактарызаваныя як «філасофская проза», часта адначасова могуць быць названыя раманам выхавання. З гэтым жанрам філасофскі раман радніць асаблівую ўвагу да гісторыі фарміравання светапогляду персанажа і тое значэнне, якое ў сюжэце адыгрывае інтэлектуальнае жыццё героя. Аднак філасофскі раман можа не ўтрымліваць апісання станаўлення характару галоўных персанажаў, што з'яўляецца характэрнай асаблівасцю для рамана выхавання |
| Фантастыка і фэнтэзі | Характарызуецца ўжываннем фантастычных допушчэнняў, шматлікіх умоўнасцей, нерэальнасцю таго, што адбываецца |
| Прыгодніцкая літаратура і літаратура падарожжаў | Арыентавана на забаву чытачоў. Апісваюцца падарожжы ў экзатычныя краіны, пошукі скарбаў або старажытных артэфактаў: усё тое, што адкрывае захапляльны новы свет неверагодных прыгод і «ратуе» ад свету звыклага, звычайнага, сумнага |
| Гумар і сатыра | Высмейваюцца пэўны прадмет, погляды, меркаванні з мэтай пераносу на жыццёвыя сітуацыі |
| Дзіцячая літаратура | Літаратура, якая прызначана спецыяльна для дзяцей да 16 гадоў і якая ажыццяўляе мовай мастацкіх вобразаў задачы выхавання і адукацыі дзяцей |

# 8 Клас

## Кантрольнае сачыненне-разважанне на аснове прыказкі




► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць | Па-мойму, я думаю, я перакананы, мне здаецца |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | Па-першае, па-другое, напрыклад, акрамя гэтага, каб пераканацца, чаму ж, і нарэшце |
| Вывад | Вынік разважання | Таму, такім чынам, так як, словам, усё гэта, значыць |

► Матэрыял для падрыхтоўкі да кантрольнага сачынення

| | |
|---|---|
| Чужому навучайся, ды свайго не цурайся | Заклікае заставацца часцінкай свайго народа, узбагачаючы яго мудрасцю іншых народаў. З аднаго боку, трэба ўмець карыстацца ведамі і тэхналогіямі, якія выпрацаваны ў свеце. Навошта прыдумляць веласіпед, калі ён ужо даўно створаны? Не толькі не сорамна, але і пахвальна вучыцца чаму-небудзь карыснаму ў іншых. А для гэтага неабходна авалодваць замежнымі мовамі, цікавіцца культурай і навукай іншых народаў.<br>З іншага ж боку, узбагачаючыся ведамі, кожны чалавек павінен памятаць свае карані і родныя святыні. У адваротным выпадку ён стане перакаці-полем без роду і племя. Не будзе з кім падзяліць радасць, да каго звярнуцца ў цяжкую хвіліну |
| Воўк сабакі не баіцца, але звягі не любіць | Пра шум і цішыню<br>К. Крапіва «Сабачанё»<br>Мультфільм «Паўлінавы хвост» |
| Плётку ў адно вуха ўпусці, а ў другое выпусці | Плётка (руск. — сплетня) — не вельмі добрая справа. Гэта паклёп, дарэмныя словы, якімі хтосьці хоча чалавеку зрабіць дрэнна. Плёткі перадаюцца праз мову адзін другому, пры гэтым уваходзяць праз вуха, а перадаюцца ротам, праз мову. Прыказка вучыць не выпускаць плёткі праз рот, не перадаваць яе іншым |
| І шыла, і мыла, і прала, і ткала — і ўсё языком | Пра ляноту, дармаедства і няўменне працаваць.<br>На словах — вялікі майстар, а на справе — нічога не робіць |
| Ні млеў, ні пацеў, а рот разявіў | Пра ляноту, дармаедства і няўменне працаваць.<br>Не працаваў, а есці хоча |
| Языком у Вільні, а галавой за печчу | Пра балбатлівасць.<br>Дзе шмат слоў, мала справы |
| Ці плач, ці галасі, але рады не дасі | Пры цяжкіх жыццёвых абставінах не плач, бо слязамі бядзе не дапаможаш |
| У людзей пытай, а свой розум май | Вучыць самастойнасці, але ў пэўнай ступені, бо раіць усё ж такі не сыходзіць ад людзей, іх слухаць, але мець уласны розум. Вось гэта і будзе ўмовай поспеху для чалавека справы |

## Водгук на празаічны або паэтычны твор

► Практыкаванне «Суаднясенне».

Слова «водгук» мае некалькі значэнняў. Па азначэннях устанавіце адпаведнасць, запісаўшы адказ у выглядзе: А1Б2В3Г4Д5 (работа ў парах).

| | |
|---|---|
| А. Слабы гук, які даносіцца здалёку | 1. Водгук на чужое гора жыў у сэрцы [Ядвісі]. *Я. Колас* |
| Б. Жанр мастацкай творчасці, для якога характэрна суб'ектыўнасць у аналізе і ацэнцы зместу твора | 2. Творы [Лынькова, Чорнага, Труса] з'явіліся гарачым водгукам на хвалюючыя пытанні свайго часу. *Я. Казека* |
| В. (перан. знач.) Спачувальныя адносіны, салідарнасць з чым-небудзь | 3. З ветрам, што кідаўся зверху, даносіліся водгукі нейкіх слоў, крыку. *М. Лынькоў* |
| Г. (перан. знач.) Тое, што з'яўляецца вынікам чаго-небудзь, адказам на якія-небудзь падзеі, з'явы | 4. Вялікую цікавасць мелі [Купалавы] водгукі аб паэзіі Адама Міцкевіча. «*Полымя*» |
| Д. (разм. слова) Тое, што і водзыў | 5. На алімпіядзе дзевяцікласнікам прапанавалі напісаць водгук на верш М. Танка «Шчасце». |

Адказ: А_Б_В_Г_Д_.

► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць | стварае, дае ўяўленне (уражанне) аб...<br>сведчыць аб...<br>перадае (што)...<br>адлюстроўвае ці асвятляе (што)...<br>выяўляе (што)...<br>дае магчымасць зразумець...<br>дазваляе адчуць...<br>раскрывае ці ўвасабляе...<br>прымушае задумацца...<br>гаворыць аб...<br>забяспечвае разуменне, увасабленне ці ўспрыманне...<br>узнікае разуменне ці адчуванне...<br>уражанне (якое)...<br>характарызуе (што)... |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | |
| Вывад | Вынік разважання | |

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| | | садзейнічае...<br>уцягвае ў...<br>спрыяе перадачы...<br>акцэнтуе ўвагу (на чым)...<br>у (чым) заключана...<br>аказвае ўздзеянне на..., якое служыць для...<br>вызначае ці ўжывае...<br>прыцягвае ўвагу...<br>заслугоўвае ўвагі...<br>дасягае...<br>прыходзіць адчуванне...<br>змог адшукаць ці перадаць, вызначыць ці знайсці...<br>валодае майстэрствам у паказе...<br>дае ўяўленне аб...<br>з'яўляецца ўвасабленнем аўтарскага ідэалу...<br>з'яўляецца адчуваннем...<br>удалося стварыць...<br>выяўляецца (што і як)...<br>у... (чым) заключана (што)...<br>з'яўляецца асновай (чаго)...<br>(што)... сугучна (чаму)...<br>дасягаецца...<br>(чаму)... уласціва (што)...<br>(што)... выпісана (як)...<br>успрымаецца... (як)...<br>мэтазгодна акрэсліць (што)...<br>прыводзіць да разумення...<br>(для чаго) выкарыстана...<br>удаецца стварыць...<br>паказаў магчымасці...<br>(што) знаходзіць выяўленне ў...<br>чытачу адкрываецца... |

► Дадатковы матэрыял

| | Ці праўда, што... | +/− |
|---|---|---|
| 1 | Салодкі лімон — аксюмаран | |

| | Ці праўда, што... | +/− |
|---|---|---|
| 2 | Ён добры, а я яшчэ лепшая — суплетывізм | |
| 3 | Не кашуля, а сшыта — паралелізм | |
| 4 | Раніца сонечная — інверсія | |
| 5 | Зялёная трава — метафара | |
| 6 | Шануйце мову, каб не ўмёрлі! (*Ф. Багушэвіч*) — афарызм | |
| 7 | Ішла Саша па шашы — анафара | |
| 8 | Лісце трапечацца — эпітэт | |
| 9 | Горкі мёд — параўнанне | |
| 10 | Яе губкі, як малінкі; твар, як лілея (*Я. Купала*) | |

## Кантрольнае сачыненне на маральна-этычную тэму

► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць | Па-мойму, я думаю, я перакананы, мне здаецца |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | Па-першае, па-другое, напрыклад, акрамя гэтага, каб пераканацца, чаму ж, і нарэшце |
| Вывад | Вынік разважання | Таму, такім чынам, так як, словам, усё гэта, значыць |

## Сачыненне-разважанне. Ліст свайму сябру па інтэрнэт-перапісцы «Што я ведаю пра інтэрнэт-этыкет?»

► Запоўніце чэк-ліст, адзначаючы знакамі:

«+» — ведаю/выконваю правіла;
«−» — не ведаю/не выконваю правіла.

► Інтэрнэт-этыкет

| № | Правіла | Ведаю правіла | Выконваю правіла |
|---|---|---|---|
| 1 | Думайце пра сваіх субяседнікаў! | | |
| 2 | Пакажыце сябе з лепшага боку! | | |
| 3 | Спачатку чытайце, пасля пытайцеся! | | |
| 4 | Не забывайце пра правілы арфаграфіі і пунктуацыі! | | |
| 5 | Паважайце асабістыя дадзеныя іншых! | | |
| 6 | Паважайце час і магчымасці іншых! | | |
| 7 | Пазбягайце слоўнай «бойкі»! | | |
| 8 | Выконвайце правілы згуртаванняў! | | |
| 9 | Не паведамляйце іншым асабістую інфармацыю! | | |
| 10 | Выкарыстоўвайце нейтральныя псеўданімы! | | |
| 11 | Не давярайце ўдзельнікам чата! | | |
| 12 | Пазбягайце сеткавых ботаў і троляў! | | |
| 13 | Не перапісвайцеся з незнаёмымі! | | |
| 14 | Будзьце асцярожны пры анлайн-гульнях! | | |
| 15 | Прытрымлівайцеся тых правіл зносін, што і ў рэальным жыцці! | | |

► Састаўленне плана.

| План | | |
|---|---|---|
| Частка сачынення-разважання | Змест | Лексічнае суправаджэнне |
| Тэзіс | Думка, якую трэба даказаць (Ці трэба ведаць і выконваць правілы паводзін у інтэрнэце?) | Па-мойму, я думаю, я перакананы, мне здаецца |
| Доказ | Факты, якія пацвярджаюць правільнасць тэзіса | Па-першае, па-другое, напрыклад, акрамя гэтага, каб пераканацца, чаму ж, і нарэшце |
| Вывад | Вынік разважання | Таму, такім чынам, так як, словам, усё гэта, значыць |

## Сачыненне-апісанне па карціне У. Сулкоўскага «Елка ў пары з хваіною»

► Запоўніце табліцу.

| | Пярэдні план | Сярэдні план | Задні план |
|---|---|---|---|
| 1. Што адлюстравана? | | | |
| 2. Колеравая гама | | | |
| 3. Уражанне ад карціны | | | |

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Уступ<br>а) Звесткі пра жыццё і творчасць мастака (яго найбольш вядомыя карціны, асаблівасці выканання, напрамкі, стылі працы, гады актыўнай творчасці).<br>б) Даведка аб карціне (год стварэння, яе жанр, гісторыя стварэння, лёс карціны, пад уплывам якіх падзей напісана).<br>2. Асноўная частка (аналіз)<br>а) Аналіз карціны.<br>б) Апісанне пярэдняга, сярэдняга і задняга планаў.<br>в) Дэталі, іх роля ў карціне.<br>г) Колеравая гама, асноўныя фарбы, іх роля ў карціне.<br>д) Сродкі выразнасці (кампазіцыя, перспектыва, святло і цень), роля гэтых сродкаў у выяўленні аўтарскай пазіцыі, ідэі карціны.<br>3. Заключэнне<br>а) Уласнае меркаванне аб карціне.<br>б) Агульны аналіз і апісанне таго, што хацеў сказаць аўтар |

## Сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры)

► Практыкаванне «Суаднясенне».

Слова «помнік» мае некалькі значэнняў. Па азначэннях устанавіце адпаведнасць, запісаўшы адказ у выглядзе: А1Б2В3Г4Д5 (работа ў парах).

| | |
|---|---|
| А. Архітэктурнае або скульптурнае збудаванне ў знак ушанавання памяці якой-небудзь асобы або падзеі | 1. Літаратурныя помнікі гэтага часу нешматлікія. *В. Івашын* |

| | |
|---|---|
| Б. (перан. знач.) Тое, што напамінае аб чыіх-небудзь справах | 2. Тут жа, побач, над брацкай магілай стаіць помнік. *І. Бялевіч* |
| В. Збудаванне на магіле з граніту, мармуру і пад. у памяць памёршага | 3. Недалёка ад плошчы ўбачыў драўляную царкву, цікавы помнік народнага ўмельства. *В. Вольскі* |
| Г. Твор старажытнай пісьменнасці | 4. Пасярод плошчы ўзвышаўся помнік У. І. Леніну. *Т. Хадкевіч* |
| Д. Прадмет матэрыяльнай культуры мінулага | 5. Вырастуць дрэвы і будуць помнікам тым, хто загінуў у імя гэтай перамогі... *І. Шамякін* |

Адказ: А_Б_В_Г_Д_.

► Практыкаванне «Пáмятаем!»

Групы помнікаў

| **Па прызначэнні** | **Па тыпу пабудоў** |
|---|---|
| Помнікі знакамітым асобам (паэтам, пісьменнікам, музыкантам, мастакам, навукоўцам, вайскоўцам)<br>Мемарыялы воінскай славы<br>Помнікі-прысвячэнні<br>Мемарыялы пахаванняў<br>Рэлігійная архітэктура<br>Значныя гістарычныя падзеі і іх героі<br>Вядомыя літаратурныя і гарадскія персанажы<br>Пачуцці, вечныя каштоўнасці<br>Незвычайныя аб’екты | 1. Жанравыя кампазіцыі<br>2. Мемарыяльныя комплексы<br>3. Манументальная гарадская скульптура<br>4. Стэла<br>5. Бюст<br>6. Мемарыяльныя дошкі<br>7. Скульптурная група<br>8. Абеліск<br>9. Статуя<br>10. Пліта<br>11. Дэкаратыўная скульптура<br>12. Мемарыяльная дошка |

► Якія помнікі ёсць у вашым населеным пункце?






Від: манумент.

Месцазнаходжанне: г. Жодзіна, вул. Цімiразева.

Дата адкрыцця: 29 жніўня 1975 г.

Аўтары: архітэктар А. Р. Трафімчук, скульптары А. М. Заспіцкі, І. Я. Міско, Н. А. Рыжанкоў.

Матэрыял: мармур, бетон, граніт, бронза.

Тэхніка вырабу: ліццё.

Вышыня помніка: 4 метры.

Фігуры выкананы ў поўны рост.



| Кампазіцыя | |
|---|---|
| Ці можна вызначыць часткі кампазіцыі? | |
| Колькі фігур у кампазіцыі помніка? | |
| З якога матэрыялу фігуры? | |
| Дакажыце, што часткі кампазіцыі кантрасныя | |
| Якімі паказаны сыны? | |
| Які позірк у Пеці? | |
| Маці | |
| Дзе стаіць? | |
| Якое адзенне? | |
| Што чытаецца ў вачах? | |
| Дзе трымае руку? Чаму? | |

► Састаўленне плана.

| План |
|---|
| 1. Пачатак (узаемасувязь мінулага і сённяшняга, гісторыя стварэння помніка, месца знаходжання, аўтары: каму прысвечаны помнік; дзе і калі ўзведзены).<br>2. Асноўная частка. Апісанне помніка:<br>а) агульны выгляд;<br>б) кампазіцыя, яе часткі;<br>в) дэталі помніка. Апісанне знешняга выгляду герояў: рух сыноў — статычнасць маці, адзенне, выгляд твару, вачэй;<br>г) што акружае помнік, як ён упісваецца ў навакольнае асяроддзе? (Помнік стаіць сярод маладой пасадкі дрэў, добра ўпісваецца ў навакольнае асяроддзе.)<br>3. Заключэнне (мае адносіны да мінулага, да гістарычных і культурных помнікаў; уражанні ад помніка, якія думкі і пачуцці ён выклікае) |

► Дадатковы матэрыял

Не дачакаўшыся сыноў адтуль —
З вайны вялікай, з прорвы апраметнай,
Сышлі ў магілу тысячы матуль —
Марыль, Парасак, Кацярын, Настуль —
Сышлі звычайна, ціха, непрыкметна,
Як і жылі пад зоркай пракаветнай...
Што ў міг апошні думалі яны?
Што іх дзяцей не будзе ля труны.

*Н. Гілевіч*

Да болю можа кожны прыцярпецца
І да няшчасця, толькі не яны,
Што страцілі дзяцей...
Гарыць для іх цяпельца
На тым далёкім беразе вайны.

*П. Панчанка*

► Незвычайныя помнікі Беларусі

Помнік слоіку згушчанага малака ў Рагачове.
Помнік літары «у нескладовае» ў Полацку.
Помнік бабру ў Бабруйску.
Помнік вішні ў Глыбокім.
Помнік агурку ў Шклове, Альшанах.
Помнік крату ў Салігорску.
Помнік старому Хатабычу ў Віцебску.
Помнік жабе-падарожніцы ў Гродне.
Помнік Фёдару Махнову (самаму высокаму чалавеку на планеце) у Віцебску.